«Гістарычны слоўнік беларускай мовы» — надзейная крыніца звестак пра мінулае Беларусі. Ён змяшчае каштоўную інфармацыю пра жыццё беларускага народа, яго матэрыяльную і духоўную культуру на працягу 500 гадоў *(Паводле А. Дзядовай)*.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае лексічнае значэнне ‘напісанне навуковай працы праз падбор і аб'яднанне якіх-небудзь матэрыялаў’.

**224.** Падбярыце да ўстарэлых слоў *сеча, чало, пілігрым, кляса, краса* сінонімы, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове.

Д л я  д а в е д к і: *лоб, бой, прыгажосць, клас, вандроўнік*.

Зрабіце фанетычны разбор слова *прыгажосць*.

## § 30. Неалагізмы

**225.** Разгледзьце малюнкі. Запішыце словы — назвы транспартных сродкаў. Паразважайце, у сувязі з чым узнікаюць новыя словы.



Д л я  д а в е д к і: *конка, карэта, скутар, квадрацыкл*.

**226.** З прапанаваных частак «пабудуйце» новае слова. Запішыце яго.

| | | |
|---|---|---|
| **neos** (ад грэч.) — новы | **logos** (ад грэч.) — слова | **-ізм-** |



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**Неалагізмы** — гэта словы, якія ўзніклі ў мове як назвы новых прадметаў ці з'яў і маюць адценне навізны: *спонсар, дызайнер, брэнд, блогер, сайт.*

Неалагізмы ўзніклі ў выніку змен у жыцці грамадства, развіцця навукі і тэхнікі.

**227.** Якія словы мы ўжываем, калі гаворым:

1) пра тонкія хрумсткія шматкі бульбы, смажаныя ў алеі;
2) пра запечанае тонкае цеста з кавалачкамі каўбасы, грыбоў ці агародніны;
3) пра смажаную гарачую катлету ў разрэзанай напалову круглай булцы;
4) пра персанальны камп'ютар у выглядзе кнігі, які вертыкальна адкрываецца?

Для даведкі: *піца, чыпсы, ноўтбук, гамбургер.*

**228.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з тэксту неалагізмы.

Інтэрнэт — важная частка жыцця сучаснага чалавека. Адкуль бярэцца інтэрнэт? Тэрабайты інфармацыі перадаюцца па высакаякасных кабелях. Амаль увесь глабальны трафік праходзіць праз іх. Інтэрнэт падтрымліваюць розныя серверы*, вышкі сотавай сувязі, спадарожнікі, смартфоны. Сайты навін, сацыяльныя сеткі — гэта не толькі крыніца інфармацыі, але і спосаб зносін людзей. У Беларусі жыве каля 10 мільёнаў чалавек, а актыўных карыстальнікаў сім-карт — каля 12 мільёнаў. Гэта самы высокі паказчык сярод краін-суседак *(З інтэрнэт-крыніц).*

*інтэрнэ́т*

**229.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце па-беларуску асноўную думку тэксту. Як вы разумееце значэнне выдзеленага ў тэксце слова?

На календарной странице уже весна, а за окном хмурое небо. Как же так? Эти хмурые деньки указывают на то, что мы должны взять себя в руки и быть радушными и трудолюбивыми, готовыми протянуть руку помощи своим **ближним**. Будьте прилежны в учёбе. Не давайте себе возможности стать ленивыми и невнимательными. Пусть в вашем сердце живёт надежда и уверенность в завтрашнем дне *(Из журнала «Незнайка»)*.

Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

На аснове звестак з тэксту складзіце выказванне «Якія парады вы можаце прапанаваць сваім сябрам?».

**230.** Спішыце тэкст. Знайдзіце і падкрэсліце неалагізмы, якія ўтварыла аўтар верша.

Ёсць **касмадром, аэрадром,**
і ёсць цікавы **іпадром***.
Мы ж пабудуем смехадром.
Яшчэ нам трэба жартадром.
Прыходзьце разам будаваць
і весяліцца, жартаваць.

*Н. Галіноўская.*



Растлумачце значэнні выдзеленых слоў. Што абазначае агульная частка слоў *-дром*? Як вы разумееце значэнні слоў *жартадром, смехадром*?

Прыдумайце жартаўлівыя неалагізмы з агульнай часткай *-дром*, якія будуць мець наступныя значэнні:

1) месца, дзе ўсім весела;
2) месца, дзе заўсёды свята.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі